Шыфр:____________________________

Колькасць балаў:__________________

Месца:___________________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі
______________________Р.С. Сідарэнка
______________________2016 года

# ТРЭЦІ ЭТАП XXXIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**10 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт І**

**Заданне 1.** Пастаўце знак «+» насупраць слоў, у якіх ёсць прыстаўка з канцавым мяккім зычным гукам.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| | | | |
|---|---|---|---|
| неад’емны | | абіваць | |
| асвістаць | | збіцца | |
| ссекчы | | снедаць | |
| усцешаны | | з’ява | |

**Заданне 2.** Насупраць прыведзеных сінанімічных фразеалагізмаў упішыце ў табліцу яшчэ адзін фразеалагізм-сінонім з кампанентам ***вуха***.

*Максімальная колькасць балаў – 6* (2 балы – за кожны правільна вызначаны фразеалагізм).

| | |
|---|---|
| падстаўляць плячо (*каму*)<br>падпіраць плячом (*каго*)<br>браць на буксір (*каго*) | |
| хоць бы хны<br><і> не лыс<br><і> у вус <сабе> не дзьмуць | |
| аж нос гнецца<br>за абедзве шчакі<br>на поўны рот | |

**Заданне 3.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Услыхав это, я замер на своем месте. Вперив глаза в опушку, я бессмысленно улыбался; пот катился с меня градом, и хотя капли его, сбегая по подбородку, щекотали меня, я не вытирал их. Мне казалось, что не может быть решительнее этой минуты. Положение этой напряженности было слишком неестественно, чтобы продолжаться долго. Гончие то заливались около самой опушки, то постепенно отдалялись от меня; зайца не было. Я стал смотреть по сторонам *(По Л. Н. Толстому)*.

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

**Заданне 4.** *Як рукою з нас здымаюць Зёлкі боль і нагавор, Бо ў сябе яны ўбіраюць Моц зямлі, лугоў прастор* (У. Лабко).

Гатуем "марфемны адвар". Уважліва "перабярыце" кожны карэньчык, кожную сцяблінку і лісцік лекавых раслін. Запішыце назіранні ў табліцу.

Максімальная колькасць балаў – *4* (1 бал за кожнае правільна разабранае слова).

| **Назва расліны** | **Утваральная аснова** | **Спосаб словаўтварэння** |
|---|---|---|
| Узор: *Канюшына лугавая* | *луг (□) +ав (ы)* | суфіксальны |
| *Бяроза* ***павіслая*** | | |
| *Ліпа* ***сэрцалістая*** | | |
| *Кадзіла* ***сармацкае*** | | |
| *Крапіва* ***двухдомная*** | | |

**Заданне 5.** Падарожнічаем па краіне і складаем турыстычнае выданне *«Запрашаем у Беларусь!»* Адрэдагуйце матэрыял для гэтага зборніка, паставіўшы словы ў дужках у патрэбнай форме.

*Максімальная колькасць балаў – 5* (1 бал за кожнае правільна напісанае слова).

1. У 1885 г. беларус В. Цэраскі адкрыў існаванне так званых серабрыстых аблокаў і ўстанавіў, што яны знаходзяцца над планетай (*Зямля*) _______________ на вялікай адлегласці. 2. А.Кіркор сцвярджаў, што першапачатковая назва горада (*Вільня*) __________________ – Крывы горад – паходзіць ад імя жраца Крэве, які нібыта жыў у гэтым горадзе. 3. Выпраўляючыся да возера (***Свіцязь***) _______________, варта пакласці ў пляжную торбу томік Адама Міцкевіча, многія вершы якога звязаны з гэтым краем. 4. Некаторыя вучоныя лічаць, што ў аснове назвы горада (*Мар'іна Горка*) ____________________________ ляжыць пакланенне багіні Мары – апякунцы жанчын і дзяцей. 5. Вядомы гісторык М. Ермаловіч адзначае, што з Пасожжа дулебы прыйшлі ў басейн ракі (*Ака*) _________________.

**Заданне 6.** Ці памятаеце вы лінгвістычныя тэрміны? Вызначце, азначэнні якіх паняццяў пададзены ніжэй.

*Максімальная колькасць балаў – 5* (1 бал за кожны правільна запісаны тэрмін).

| | |
|---|---|
| 1. Дзеясловы, якія абазначаюць дзеянне, што пераходзіць на які-небудзь прадмет ці асобу, – | |
| 2. Форма прыметніка, якая абазначае самую высокую або самую нізкую ступень якасці, – | |
| 3. Займеннікі, што ўказваюць на блізкія ці аддаленыя прадметы, іх якасці і колькасць, – | |
| 4. Самастойная нязменная часціна мовы, якая абазначае прымету дзеяння або прымету іншай прыметы ці прадмета, – | |
| 5. Часціцы, што ўдакладняюць і падкрэсліваюць значэнне слоў, перад якімі стаяць, – | |

**Заданне 7.** *«Куцця. Марозна. Хмурнавата. Сняжок падкідвае заўзята...»* А мы разам з Вамі гатуем калядны КВАС па "рэцэпце" маці Костуся. Коласава паэтычная прэзентацыя гэтага святочнага пачастунка адбылася ў раздзеле *«Каляды»* («Новая зямля»).

Запішыце ў рэцэптурны ліст пяць асноўных складнікаў гэтай стравы, прыгатаванай на хлебным (ці бураковым) квасе.

СМАЧНА ЕСЦІ!



**Заданне 8.** Разгадайце крыжаванку.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*




**Па гарызанталі:**

2 – Невялікі эпічны твор, у якім характар чалавека раскрываецца праз асобныя падзеі, здарэнні; мае, як правіла, адну сюжэтную лінію.

4 – Цвёрдая форма лірычнага твора, якая складаецца з 14 радкоў і мае своеасаблівую рыфмоўку (напрыклад, абба абба ввг дгд). Гэта адна з улюбёных форм паэзіі У. Шэкспіра, М. Багдановіча, Я. Сіпакова і інш.

7 – Цвёрдая форма лірычнага твора з 8 радкоў, у якім паўтараюцца два першыя і два апошнія радкі, а таксама першы і чацвёрты. Такія вершы нярэдка сустракаюцца ў творчасці В. Брусава, П. Труса, М. Багдановіча і інш.

9 – Сярэдні па памеры эпічны твор, які ахоплівае некалькі эпізодаў жыцця галоўнага героя.

**Па вертыкалі:**

1 – Жанр драматургіі, прамежкавы паміж трагедыяй і камедыяй. Драматургічны твор з сямейна-бытавым ці гістарычным сюжэтам.

3 – Жанр драматургіі; драматургічны твор, у якім смешна паказваюцца розныя (часцей адмоўныя) з'явы жыцця.

5 – Асноўная думка твора; тое, што вынікае з усяго адлюстраванага.

6 – Вялікі эпічны твор з ускладненым зместам, разгалінаваным сюжэтам.

7 – Тое, пра што ідзе размова ў творы, што ў ім паказваецца.

8 – Жанр драматургіі; драматургічны твор, у аснове якога ляжыць востры канфлікт, барацьба супрацьлеглых сіл, якая заканчваецца, як правіла, смерцю героя.

**Заданне 9.** Вы бачыце вокладкі знакавых для беларускай культуры кніг. Пад кожнай з іх напішыце нумары тых гісторыка-літаратурных рэалій, якія звязаны з гэтымі кнігамі.

**Увага!** Сярод пераліку гісторыка-літаратурных рэалій ёсць "лішнія", што не адносяцца да прадстаўленых у заданні кніг.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*








| Да гэтай кнігі адносяцца наступныя гісторыка-літаратурныя рэаліі: | Да гэтай кнігі адносяцца наступныя гісторыка-літаратурныя рэаліі: | Да гэтай кнігі адносяцца наступныя гісторыка-літаратурныя рэаліі: |
|---|---|---|
| ______________ | ______________ | ______________ |

**Пералік гісторыка-літаратурных рэалій:**

1) кніга выдадзена ў Празе;
2) кніга была падрыхтавана за чатыры гады да з'яўлення ў свет, але вайна перашкодзіла выданню;
3) у кнізе вылучаны тры раздзелы: «Роднаму краю», «На чужыне», «Праявы роднага»;
4) кніга выдадзена ў Пецярбургу;
5) кніга мае прысвячэнне аднаму з аўтараў «Нашай нівы»;
6) кніга мае прысвячэнне бацьку і маці аўтара;
7) у кнізе праз вобразы Кнігі, Летапісца, Перапісчыка аўтар скіроўвае ўвагу чытача на неабходнасць асэнсавання ролі культурнай спадчыны мінулага;
8) аўтар кнігі быў рэдактарам газеты «Беларускі шлях»;
9) кніга была выдадзена па замове Папы Рымскага Льва Х;
10) аўтар кнігі вядомы як крытык (артыкулы «Глыбы і слаі», «За тры гады» і інш.);
11) прадмову да кнігі напісаў сам выдавец;
12) кніга была падрыхтавана сябрамі паэта з твораў, дасланых з Сібіры;
13) кніга выдадзена выдавецкай суполкай «Загляне сонца і ў наша ваконца»;
14) у кнізе вылучаны 8 цыклаў: «Згукі Бацькаўшчыны», «Думы», «Старая спадчына» і інш.;
15) аўтар прадмовы да кнігі меў вучоную ступень доктара лекарскіх навук;
16) кніга была выдадзена пры матэрыяльнай падтрымцы віленскіх мецэнатаў Якуба Бабіча і Багдана Онкава.

**Заданне 10.** Прачытайце верш Міхася Стральцова і запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

Пра што пісаць, і як пісаць, і дзе?
Пра тое толькі ведае выпадак.
Ён свой вядзе парадак-распарадак,
Варожачы на гушчы ці вадзе.

Той міг пасля шчаслівым назаві,
Што свой звядзе пачатак і канчатак,
Слязу ў вачах і смех у вачанятах, –
Дык не чакай, а дзейнічай, жыві!

| | |
|---|---|
| 1. Памер верша | |
| 2. Тып рыфмоўкі | |
| 3. Сінтаксічны сродак мастацкай выразнасці ў першай страфе | |
| 4. Радок, у якім заключаецца галоўная ідэя твора | |